присущи универсальные символы и атрибуты в раскрытии женских образов, однако они несут в себе национальную специфику и дополняют образы героинь.

Таким образом, с помощью композиции, жанра, нарратива, системы символов и образов и проблемно-тематического поля Янке Купале и Маргарет Этвуд удается представить образы Павлинки и Пенелопы, используя национальные и универсальные особенности воплощения женских образов. Будучи представительницей молодежи Беларуси 1910-х годов, Павлинка раскрывается как деятельный персонаж, она способна идти против устаревших традиций и совершать радикальные действия для достижения личной свободы и счастья, в то время как Маргарет Этвуд изображает субалтерную личность, подавленную патриархальным обществом и переосмысливающую свой травматический опыт.

## Библиографический список

1. Васючэнка, П. Драматычная спадчына Янкі Купалы: вопыт сучас. прачытання / П. Васючэнка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1994. – 173 с.

2. Купала, Я. П'есы, пераклады / Я. Купала. – Мінск: Юнацтва, 1992. – 303 с.

3. Этвуд, М. Пенелопиада / М. Этвуд; пер. с англ. А. Блейз. – М.: Открытый Мир, 2006. – 166 с.

4. Shastri, S. Revisi(Ti)Ng The Past: Feminist Concerns In Margaret Atwood's The Penelopiad / S. Shastri. – Aranzadi, 2008. – P. 141–149.

*УДК 821.161.3.09:82.09*

# АДЛЮСТРАВАННЕ ВОБРАЗА МАЦІ Ў ПАЭЗІІ ЯКУБА КОЛАСА, Р. БАРАДУЛІНА І Я. СЭЙФЕРТА

**Ю. А. Шлемен**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*yulenka.shlemen@mail.ru*

У артыкуле аналізуюцца творы Якуба Коласа, Р. Барадуліна і Я. Сэйферта, у якіх паэты звяртаюцца да вобраза маці. Агляд некаторых мастацкіх сродкаў дапамагае вылучыць тыя адрозненні, якія істотна ўплываюць на адлюстраванне вобраза маці ў беларускай і чэшскай літаратурах.

*Ключавыя словы:* аўтабіяграфізм у паэзіі; вобраз маці; паэзія Якуба Коласа; творчасць Р. Барадуліна; вершы Я. Сэйферта.

# REFLECTION OF THE MOTHER'S IMAGE IN THE POETRY OF YAKUB KOLAS, R. BARADULIN AND J. SEIFERT

**Y. A. Shlemen**

*Belarussian State University*
*Minsk, Republic of Belarus*
*yulenka.shlemen@mail.ru*

The article analyzes the works of Y. Kolas, R. Baradulin and J. Seifert, in which the poets turn to the image of the mother. The review of some artistic means helps to identify those differences that significantly affect the reflection of the image of the mother in the Belarusian and Czech literatures.

*Key words:* autobiography in poetry; the image of the mother; the poetry of Yakub Kolas; the work of R. Baradulin; the poems of J. Seifert.

Вобраз маці аказвае моцны ўплыў на жыццёвы шлях чалавека. Менавіта таму архетып маці сустракаецца яшчэ ў фальклоры і міфалогіі, у якіх становіцца сімвалам жыцця і вечнасці, і з'яўляецца скразной тэмай ва ўсіх відах мастацтва на працягу гісторыі чалавецтва. Дадзены вобраз сустракаецца не толькі ў жывапісе і музыцы, але ў класічнай і сучаснай літаратуры. Маці і яе адзінства з дзіцём – гэта адзін з самых частотных і знакавых вобразаў у сусветнай літаратуры.

Балгарскі даследчык Г. Д. Гачаў лічыць, што нацыянальныя вобразы (сімвалы) свету, якія адлюстроўваюць этнічныя асаблівасці народа, звычайна абумоўлены шматвекавымі нацыянальнымі традыцыямі. Аднак ва ўсёй сістэме вобразаў выкрышталізоўваюцца толькі тыя сімвалы, што маюць асаблівую каштоўнасць для пэўнага этнасу. Адзін і той жа вобраз можа па-рознаму трактавацца рознымі народамі. Варта адзначыць, што як у беларускай, так і ў чэшскай літаратурах вобраз маці з'яўляецца канцэптуальным вобразам. Для таго каб выявіць асаблівасці ў паказе дадзенага вобраза ў абедзвюх славянскіх літаратурах, мы звернемся да аналізу творчасці беларускіх класікаў (Якуба Коласа, Р. Барадуліна) і адзінага чэшскага Нобелеўскага лаўрэата (Я. Сэйферта) і паспрабуем выявіць асаблівасці ў апісанні вышэйзгаданага вобраза. Прадметам нашага даследавання з'яўляецца вобраз маці ў паэзіі беларускіх і чэшскага паэтаў. Аб'ект даследавання – паэма «Новая зямля», паэтычныя зборнікі «Евангелле ад мамы» і «Мама».

Якуб Колас – класік беларускай літаратуры, які здолеў у сваёй паэзіі адлюстраваць у вобразе жанчыны не толькі клапатлівую маці, але і працавітую жанчыну. На пачатку творчасці пісьменнік вельмі яскрава адлюстроўваў звычайнае жыццё простага селяніна, прычым паэт апісваў не толькі клопаты, норавы і звычаі, але стварыў разнастайныя вобразы сялян, паказаў іх мудрасць і працавітасць. Варта адзначыць, што асаблівую ўвагу ён надаваў апісанню цяжкай працы жанчын, паколькі сам паходзіў з вялікай сялянскай сям'і і на ўласныя вочы бачыў, як нялёгка прыходзілася яго маці: «Работы ў маці ставала: дзяцей было восьмера, значыць, з дарослымі, а з намі ўвесь час жыў дзядзька Антось, за стол садзілася нішто сабе дружына. Апрача таго, трэба было абшыць і абмыць усю гэтую плойму. Гаспадыня і прысесці не мела часу» [11, с. 20].

Вобраз нястомнай і працавітай маткі паказаны ў вершы «Маці». З дапамогай частага выкарыстання дзеясловаў і дзеепрыслоўяў пісьменнік перадае вялікую колькасць працы, якую робіць маці, пакуль уся сям'я адпачывае пасля цяжкага працоўнага дня: «Натрудзіўшы добра рукі, // Натаміўшы плечы, // Толькі маці з вераценцам // Туліцца пры печы // Ды прадзе, прадзе кудзельку. // Скача вераценца» [8, с. 154]. Аднак не толькі цяжар працы непакоіць «*бедную кабету*», але і колькасць тых нягод, што напаткалі яе ў жыцці. Градацыя пры апісанні гэтых цяжкасцей дазваляе чытачу адчуць усю неспрыяльнасць лёсу старой: «Вось і муж усплыў на думу – // Рана смерць скасіла!» [8, с. 221]; «Уздыхнула цяжка маці, // Аб сынку гадае, // Што ў астрозе, ў паняверцы // Кару адбывае» [8, с. 222]. Гэтая згадка ў вершы дазваляе нам атаясаміць лірычнага героя з самім паэтам, паколькі «сям'і выпала шмат іспытаў, асабліва цяжка прыйшлося пасля смерці бацькі Якуба Коласа, Міхаіла Казіміравіча» [7].

Многія пісьменнікі для адлюстравання бясконцай працы самых галоўных жанчын у іх жыцці – мам – робяць акцэнт на руках, выкарыстоўваючы эпітэты і прыметнікі з адмоўнай канатацыяй для таго, каб падкрэсліць, як складаная сялянская праца знішчае вонкавую прыгажосць жанчын. Якуб Колас таксама згадвае матчыны рукі і плечы, што не ведаюць стомы і працуюць нават уначы. Аднак у сваіх успамінах сам пісьменнік адзначаў, што найбольш за ўсё яго «заўсёды вабілі і крыху палохалі матчыны вочы. Добра яны глядзелі на нас, малых, але нібы наскрозь. Таму, калі мы рабілі якую-небудзь шкоду і маці пачынала дашуквацца вінаватага, лепей было прызнавацца самому. Зірнеш ёй у вочы і зразумееш: маці ўсё ведае і так, а дапытваецца, бо хоча, каб ты сказаў праўду» [11, с. 20].

У сваёй творчасці Якуб Колас яшчэ неаднаразова звяртаўся да вобраза маці («Матчына прычытанне», «Мацерына гора» і інш.), але найбольш яскрава і дэталёва дадзены вобраз паказаны ў паэме «Новая зямля». Пісьменнік паказвае працавітую жанчыну, клапатлівую гаспадыню і маці на прыкладзе гераіні Ганны. Нягледзячы на сялянскае паходжанне, жанчына

прадстаўлена ў паэме як матуля з багатай душой і чулым сэрцам, на якой трымаецца ўся сям'я: «А дома з дзецьмі была маці. // Яе жаночая работа // І гэта вечная турбота // То каля печы, то на полі, // Сказаць, не зводзіцца ніколі» [9, с. 13]. Галоўным жа для маткі становіцца клопат пра дзяцей і іх выхаванне. Як вядома, дадзеная паэма з'яўляецца аўтабіяграфічнай, бо нават тыя мясціны, дзе жыў паэт са сваёй сям'ёй, згадваюцца ў творы: «Вядомы факт, што ў паэме "Новая зямля" Якуб Колас назваў Альбуць Парэччам» [7]. Гэта дазваляе аўтару перадаць усе тыя цяжкасці і пакуты, якія зведала яго ўласная маці, а таму вобразы, створаныя пісьменнікам, вельмі яскрава адлюстроўваюць цяжкасці тагачаснага сялянскага жыцця.

У паэзіі Р. Барадуліна вобраз маці заўсёды знітаваны з роднай Беларуссю і малой радзімай. Гэта той вобраз, да якога паэт звяртаўся на працягу ўсёй сваёй творчасці (зборнікі «Вечалле», 1980; «Маўчанне перуна», 1986; «Руны Перуновы», 2006). У зборніку «Евангелле ад мамы» (1995) змешчаны вершы, у якіх Барадулін згадвае жыццё і ўсе перашкоды, якія выпалі на лёс маткі. «Зборнік вершаў Р. Барадуліна «Евангелле ад мамы» – своеасаблівая з'ява ў беларускай літаратуры і ў жыцці самога аўтара. У яго ўвайшлі творы сталага паэта, майстра слова, чалавека, які задумваецца над тым, з чым прайшоў па зямлі абяцанай і на каго пакіне яе», – піша Л. Жураўская [6, с. 95]. У дадзены зборнік увайшлі вершы-ўспаміны пра маці, паколькі ў творах паўстае немалады літаратурны герой, якога можна атаясаміць з самім аўтарам вершаў, што не траціць надзеі сустрэцца з мамай.

Маці паэта вымушана была многа працаваць, ахвяраваць сабой дзеля дабрабыту сына, змагацца з голадам і адсутнасцю ежы, бо хацела пракарміць сям'ю. Выхаванне дзяцей і клопаты па хаце кläліся на яе плечы. «Важна і самабытна ўвайшло ў беларускую паэзію ў гэты час малодшае пакаленне – пакаленне "шасцідзясятнікаў" (або, як яго называюць, "сярэдняе", "філалагічнае", "пасляваеннае") – паэты, што склаліся ў творчыя індывідуальнасці ў 60-я гады <…> Так, шасцідзясятнікі – пакаленне суровае, пакаленне "бязбацькавічаў"», – адзначае А. Астраух [2, с. 16]. Беларускі паэт у пасляваенны час застаўся без бацькі, а маці мусіла самастойна будаваць новую хату. Страта, якую пастаянна адчуваў маленькі сын, назаўсёды ўвайшла ў памяць дарослага чалавека, таму паэт звяртаўся да асабістых успамінаў свайго дзяцінства. Наступствы вайны аказалі моцны ўплыў на далейшае жыццё Рыгора, менавіта таму ён лічыў, што «пасля вайны быў самы багаты той, у каго быў бацька жывы» («Пасля вайны» [3, с. 114]). Аднак Р. Барадулін паказвае не толькі гаротнае жыццё маленькага хлопца, але і маладой удавы, якая павінна перамагаць усе цяжкасці: «Бацька сына, // Бацьку сын згубіў, // І застаўся я ды смутак мамы» [3, с. 200].

Варта адзначыць, што і ў сваёй творчасці пісьменнік адлюстраваў усе цяжкасці ўдовінага жыцця. Так, з дапамогай эпітэта і параўнання паэт звяртае ўвагу на працавітасць і нястомнасць маці, якая дзеля дабрабыту сына здольная ахвяраваць уласным жыццём і адмаўляцца ад адпачынку: «Працавітая, што вада, // Не ведала мама ні ўседу, ні ўладу» [3, с. 411]. Цяжкія пасляваенныя гады, адсутнасць гаспадара ў доме вымушалі жанчын мець вялікую гаспадарку і змагацца з галечай: «Калі дзяліла // Апошнюю скібку – // меней сабе, // Сыну болей»; «Ашуквала соль – // Нішчымніцу саліла // Слязою» [3, с. 332]. Менавіта таму паэт моліцца на сваю маці, сцвярджаючы, што яна была для яго багіняй.

Рыгор Барадулін вельмі цяжка перанёс смерць мамы, паколькі для яго існавала трыадзінства, на якім быў пабудаваны свет паэта: Радзіма, маці, мова. Страта мамы абазначала страту ўсяго святога, што было звязана з ёй, менавіта таму ў вершах ён неаднаразова марыў пра сустрэчу: «Мамы не стала – не стала радзімы, // Дзе нарадзіўся старэць, // І падалася душа ў пілігрымы // З мараю маму сустрэць» [3, с. 296].

Для беларускага пісьменніка мама і пасля смерці заставалася самай каштоўнай у яго жыцці. «Так ці інакш вобраз маці паэта з'яўляецца ў шмат якіх вершах Барадуліна, нідзе не паўтараючыся і красамоўна сведчачы пра сілу сыноўняй любові, можа, самай самаадданай любові ў сучаснай беларускай паэзіі», – адзначае В. Быкаў у прадмове да зборніка вершаў Барадуліна «Трэба дома бываць часцей...» [4, с. 4]. Сапраўды, паэт неаднаразова адзначаў, што талент свой атрымаў ад маці. Ён аддана любіў, развіваў і ўзбагачаў беларускую мову, праз якую адчуваў сувязь з продкамі і якую яму падарыла мама. Менавіта таму ў вершы «Дзякуй! Даруй…»

на ўласным прыкладзе адлюстравана неабходнасць выказваць свае пачуцці самым блізкім людзям, пакуль гэта не стала позна. Пасля смерці маткі аўтар адчувае сваю віну за тое, што «спазніўся пачуць яе апошняе слова» і «самаўпэўнена хлусіў сэрцу яе святому» [3, с. 297–298].

Паэт Яраслаў Сэйферт – адзіны чэшскі лаўрэат Нобелеўскай прэміі ў галіне літаратуры. Значнасць яго творчасці для чэшскай літаратуры заключаецца ў тым, што ён пражыў амаль усё XX ст., а таму прайшоў праз многія паэтычныя кірункі і літаратурныя плыні, якія ўплывалі на яго творчы светапогляд. Гэта асаблівасць дазваляе лічыць, што Я. Сэйферт быў выключным і надзвычай таленавітым чэшскім пісьменнікам, спадчына якога дагэтуль актыўна вывучаецца і даследуецца ў замежным і айчынным літаратуразнаўстве. Вершы дадзенага творцы, а менавіта іх паэтыка, тэматыка, праблематыка і ідэйны складнік не перастаюць зачароўваць не толькі чэшскіх чытачоў, але і аматараў паэзіі па ўсім свеце. Вершы Сэйферта з'яўляюцца папулярнымі ў Чэшскай Рэспубліцы і чытаюцца разнастайнымі слаямі насельніцтва. «Яраслаў Сэйферт, на мой погляд, адзін з самых цікавых паэтаў чэшскай літаратуры XX стагоддзя. Яго творчасць спалучае ў сабе авангардысцкую раскаванасць і традыцыі чэшскага верша і займае ўнікальнае месца ў свядомасці чэшскага грамадства, таму што Сэйферта чытаюць як менш адукаваныя яго слаі, так і інтэлектуалы», – мяркуе багемістка К. Айзпурвіт [1].

Асаблівае імкненне да лёгкасці і выразнасці адчуваецца ў позні перыяд творчасці пісьменніка, калі ён вырашыў згадаць сваю маладосць. Да тэматыкі дзяцінства Сэйферт, сапраўды, звярнуўся ў сталым узросце. Зборнік «Мама» быў напісаны ў пасляваенны перыяд, калі пісьменнік адчуў патрэбу ўспомніць сваё юнацтва, родны край і маці, пра што сведчаць словы літаратурнага героя, якога можна атаясаміць з самім пісьменнікам, у вершы «Maminčina kytice» («Мамін букет»): «Dost růží uz jsem viděl v žití, // nakonec zbylo těchto pár. // Dost měl jich, mnohé toužil míti, // a život přešel, jsem už stár» («Многа руж ужо бачыў у жыцці, // урэшце засталіся гэтыя некалькі. // Многа ён меў іх, многага ён жадаў, // а жыццё прайшло, я ўжо старэю») [12, с. 14–15].

Чэшскі Нобелеўскі лаўрэат і раней звяртаўся да вобраза маці ў сваёй паэзіі, але менавіта ў дадзеным зборніку вершаў гэты вобраз адлюстраваны на самым высокім мастацкім узроўні. «Настальгічна памятны характар мае зборнік «Мама». Тэма гэтага зборніка дала магчымасць Сэйферту звярнуцца да інтымнай лірыкі і, такім чынам, пазбегнуць абавязку пісаць стваральную паэзію. У сваіх успамінах ён рухаецца ад утульнага дзяцінства да сталасці і мамінай смерці. Вершы пявучыя і меладычныя, раздзеленыя ў правільныя страфы», – лічыць К. Слінгер [10].

Паколькі Я. Сэйферт увайшоў у літаратуру ў якасці паэта пад канец Першай сусветнай вайны, то ўсе ўспаміны пра складанае і беднае дзяцінства яскрава захаваліся ў памяці. «Наколькі я памятаю, была ў нас у тыя гады яшчэ адчувальная нястача. Бацька пасля вайны дастаткова доўга быў без працы, і талеркі ў нас былі амаль пустыя», – распавядаў сам пісьменнік [10]. Маці пісьменніка як гаспадыня пастаянна працавала да стомы і знясілення, клапацілася пра дзяцей. Ва ўсіх вершах дадзенага зборніка маці заўсёды прыходзіць ва ўспамінах за цяжкай працай, якую яна робіць удзень і ўначы, нягледзячы на зморанасць, адсутнасць адпачынку і жаданне спаць: «Venku už se stmívá, // maminka si zpívá, // navlekajíc nit. // Snad se jí chce spáti, // musí spravovati, // musí, musí šít» («На вуліцы цямнее, // мама спявае, // працягваючы нітку. // Магчыма, ёй хочацца спаць, // павінна рамантаваць, // павінна, павінна шыць») [12, с. 31].

Яраслаў Сэйферт прысвячае адзін верш «Татава трубка» («Tatínkova dýmka») свайму бацьку, якога любіла і падтрымлівала ўся сям'я, але ў цяжкія хвіліны маці даравала мужу ўсе яго звычкі і спадзявалася на лепшае: «Když stůně, dýmka leží // na okně pavlače. // A maminka jen stěží // nedá se do pláče.» («Калі хварэў, трубка ляжала // на акне дома. // А мама ледзь толькі // не пачынае плакаць») [12, с. 32–33].

У вершы «Маміна люстэрка» («Maminčino zrcátko») паэт апісвае люстэрка сваёй мамы, гледзячы ў якое, яна ўсё жыццё расчэсвалася. У творы паэт адлюстроўвае вобраз маці з дапамогай эпітэтаў «вясёлая», «шчаслівая». Аднойчы люстэрка трэснула, матка пастарэла і не глядзела ўжо больш на сябе. Сын вяртаецца дадому, але адзіная рэч, якая яго сустракае – маміна люстэрка, а мамы самой ужо няма. Ужываючы рэтраспекцыю, аўтар звяртаецца да сваіх шчаслівых юнацкіх гадоў, аднак не можа без слёз згадваць тое, што маці ніколі не будзе побач з ім і толькі яе люстэрка застанецца напамінам пра той бесклапотны час і яе маладосць:

«Přibíhám k ní, tiskne mě k sobě, // očima, mlčky, ptá se mě. // Pak zamoucněné ruce obě // zvedly mě rychle ze země» («Прыбягаю да яе, прыціскае мяне да сябе, // вачыма, моўчкі, пытае мяне. // Пасля абедзве рукі ў муцэ // паднялі мяне хутка з зямлі») [12, с. 21].

Творчасць чэшскага Нобелеўскага лаўрэата дазваляе чытачу адчуць той уплыў, які на яго зрабіла маці. Яна ўвесь час клапацілася пра дом і дзяцей, аднак вельмі моцна любіла сына і вадзіла яго на богаслужэнні, паколькі на працягу ўсяго жыцця заставалася набожнай каталічкай. Уплыў маці яскрава адлюстраваўся на далейшым творчым шляху паэта, паколькі ў сваіх творах ён вельмі часта звяртаўся да рэлігійнай тэматыкі і вобразаў, звязаных з хрысціянскай верай: вершы «Душычкі» («Dušičky»), «Песня пра смерць» («Píseň o smrti»), «Месяц на крыллях» («Měsíc na křídlech»), «Каля Маці Божай іверскай» («U Matky Boží iverské»), «Верш найпакорлівейшы» («Báseň nejpokornější»). Пазней Я. Сэйферт выкажацца пра гэта: «Гэтыя супрацьлегласці ўва мне таксама крыху засталіся – у жыцці і ў паэзіі» [10].

Такім чынам, Якуб Колас, Р. Барадулін і Я. Сэйферт стварылі яскравы і непаўторны вобраз маці ў сваёй паэзіі. Дадзеныя паэты перадалі складанасці жыцця ўсіх жанчын таго часу менавіта праз вобраз жанчыны-ўдавы, якая даволі часта страчвала мужчын праз складаныя абставіны, вымушаная выконваць цяжкую працу самастойна. Нягледзячы на неабходнасць працаваць і стомленасць ад працы і жыцця, выкліканага беднасцю сям'і, маці ў паэтычных творах становіцца сімвалам упэўненасці і надзеі, у якім тонкасць і чысціня чалавечых пачуццяў перамагае над складаным становішчам.

Варта адзначыць, што дзяцінства дадзеных пісьменнікаў прыпала на складаны перыяд у нацыянальнай гісторыі, што абумовіла іх зварот да аўтабіяграфізму і апісання беднага жыцця ў той перыяд. Разам з тым дэталёвы паказ працоўнага, паўсядзённага жыцця дазваляе заўважыць адрозненні ў сялянскім побыце беларусаў і гарадскім жыцці чэхаў.

Аналіз паэмы «Новая зямля» Якуба Коласа і зборнікаў «Евангелле ад Мамы» Р. Барадуліна і «Мама» Я. Сэйферта дапамог прасачыць уплыў маці на жыццёвы і творчы шлях паэтаў, сфарміраваць вобраз маткі, які захаваўся ва ўспамінах пісьменнікаў і знайшоў свой адбітак у іх творчасці, а таксама знайсці адрозненні і падабенствы ў адлюстраванні дадзенага вобраза ў іх паэзіі.

## Бібліяграфічны спіс


1. Айзпурвит, К. Ярослав Сейферт: К миллионам стихов на свете я добавил лишь несколько строк / К. Айзпурвит [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www.radio.cz/ru/rubrika/bogema/yaroslav-sejfert-k-millionam-stixov-na-svete-ya-dobavil-lish-neskolko-strok- – Дата доступа: 13.09.2022.

2. Астраух, А. Э. Рыгор Барадулін і сучасная беларуская лірыка: вучэб.-метад. дапам. / А. Э. Астраух. – Гродна: ГрДУ, 2001. – 121 с.

3. Барадулін, Р. Евангелле ад Мамы: кн. паэзіі / Р. Барадулін. – Мінск: Маст. літ., 1995. – 462 с.

4. Барадулін, Р. Трэба дома бываць часцей...: выбр. старонкі лірыкі / Р. Барадулін; прадм. В. Быкава. – Мінск: Маст., літ., 1993. – 352 с.

5. Гачев, Г. Д. Национальные образы мира / Г. Д. Гачев. – М.: Сов. писатель, 1988. – 233 с.

6. Жураўская, Л. В. Аказіяналізмы-назоўнікі ў паэтычным маўленні Рыгора Барадуліна / Л. В. Жураўская // Весн. Мазыр. дзярж. пед. ун-та імя І. П. Шамякіна. – 2013. – № 2. – С. 95–100.

7. Карповіч, А. Дзе Якуб Колас сустрэўся з ваўком і чаму дзядзька Антось быў самотны / А. Карповіч [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.spisovatele.cz/jaroslav-seifert#cv. – Дата доступу: 12.09.2022.

8. Колас, Я. Збор твораў: у 20 т. / Я. Колас. – Мінск: Беларус. навука, 2007. – Т. 1: Вершы, 1898–1910. – 621 с.

9. Колас, Я. Новая зямля / Я. Колас. – Мінск: Папуры, 2019. – 263 с.

10. Коўпы, К. Jaroslav Seifert / К. Коўпы [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://www.spisovatele.cz/jaroslav-seifert# – Дата доступу: 13.09.2022.

11. Лужанін, М. Колас расказвае пра сябе: аповесць-эсэ / М. Лужанін. – Мінск: Маст. літ., 1982. – 446 с.

12. Seifert, J. Maminka / J. Seifert. – Praha: Albatros, 2016. – 75 s.